Інтарэсы беларускага народу ў межах нямецкай акупацыі вымагаюць, каб устанаўленьнем Краёвай Рады Літвы беларусаў не дзялілі, а ўсіх іх злучылі б разам; каб у гэткай радзе — не нацыянальна–літоўскай, а папраўдзе агульнакраёвай — занялі б належнае месца ўсе нацыянальнасьці краю, а ў тым ліку беларусы; каб чысло прадстаўнікоў ад беларусаў адпавядала б чысьленасьці беларускага насяленьня ў межах акупацыі і каб беларускае грамадзянства атрымала магчымасьць паводлуг сваей думкі і сваей волі выбраць сваіх даверaных людзей.

Вось тыя варункі, на каторых беларускае грамадзянства ў занятых немцамі землях можа ждаць забясьпечаньня іх правоў і здаволеньня нацыянальных патрэб пры дачэснай арганізацыі нашага краю. І мы думаем, што толькі на гэткіх варунках яно дасьць веру Краёвай Радзе і прыложыць сваю руку да супольнай з усімі грамадзянамі краю творчай працы.

## Рэзалюцыя беларускага мітынгу 30 верасьня 1917 г.

Сабраўшыеся 30 верасьня 1917 г. у Беларускім Клюбе прадстаўнікі ўсіх кірункаў беларускага грамадзянства сталічнага места Вільні, цьвёрда веручы, што набліжаючыйся мір прынясе незалежнасьць для ўсяго Беларуска–Літоўскага краю, разьдзеленага цяпер на часьці ваенным фронтам, высказываюць сваё жаданьне, каб ужо ў часе вайны правы Беларускага народу ў межах нямецкай акупацыі былі забясьпечаны ў поўнай меры.

У мысьль гэтага сабраўшыеся заяўляюць гарачы пратэст проці падмены рэзалюцыі Глаўнай Камісіі Райхстагу аб самаўпраўленьні зямель акупацыі[1] назначэньнем Краёвай Рады Літвы, каторае нарушае элемэнтарныя асновы народнага прадстаўніцтва і[2] правы Беларускага народу на яго зямлі.

Сабраўшыеся становча трэбуюць, каб інтарэсы беларусаў пры дачэснай арганізацыі занятых немцамі часьцей нашага Краю былі забясьпечаны на гэткіх асновах:

1. усе беларускія землі акупацыі, разьдзеленыя на два Verwaltung'і: Białastok–Hrodna і Litauen[3], павінны быць злучаны ў аднэй адміністрацыйнай арганізацыі Літвы;

2. у Краёвай Радзе для ўсіх акупованых Беларуска–Літоўскіх зямель выбарныя прадстаўнікі беларускага грамадзянства павінны мець прапарцыянальнае лічэбнасьці беларусаў з гэтага боку фронту чысло месц[4].

Урэшце, сабраўшыеся лічаць абсалютна немагчымым для беларускага грамадзянства прыняць учасьце ў Краёвай Радзе Літвы пры яе цяперашняй арганізацыі[5] і даручаюць арганізатарам сходу ўчыніць патрэбныя крокі дзеля сазыву ў Вільні Беларускай Канфэрэнцыі з прадстаўнікоў усіх Беларускіх зямель акупацыі дзеля чыннага ўчасьця ў тымчасовай арганізацыі занятай немцамі часьці нашага Краю на вышэйсказаных асновах.

## Зварот да начальніка адміністрацыі акругі Літва

Выпаўняючы рэзалюцыю беларускага сходу 30 верасьня ў Беларускім клюбе, зложанага з 203 прадстаўнікоў усіх кругоў і ўсіх палітычных кірункаў беларускага грамадзянства места Вільні, мы, ніжэйпадпісаныя члены прэзыдыюма сходу, зьвяртаемся да В[ашай] Сьв[етласьці] з просьбай перадаць у Ob Ost[1] ухвалы беларусаў, высказаныя ў далучанай да гэтага рэзалюцыі.

Цьвёрда веручы, што жаданьня беларускага грамадзянства, каторыя маюць на мэце забасьпячэньне нацыянальных правоў беларусаў у межах акупацыі, будуць прыняты пад увагу найвышэйшай акупацыйнай уласьцю, мы разам з тым просім В[ашу] Сьв[етласьць] перадаць у Ob Ost нашу просьбу аб пазваленьне асобам, каторыя будуць намі дэлегаваны,